**ВЯЛІКІ БОР** – вёска ў Бароньkаўскім сельскім Савеце (да 1994 г.), за 34 км на ПдЗ ад Касцюковіч, 25 км ад чыгуначнай ст. Бялынкавічы на лініі Крычаў – Сураж, 192 км ад Магілёва, на паўн. ускраіне – невялікае возера, наПн і ПнЗ мяжуе з лесам. Транспартныя сувязі па прасёлачнай і далей па аўтадарозе Крычаў – Сураж.

Вядома з 18 ст. У 1747 г. слабада Вялікі Барок (6 дымоў), упамінаецца як ўласнасць казны ў Крычаўскім старостве. У 1779 г. вёска, 4 двары, 41 жыхар, уладанне шляхціца суддзі Гайкова. У 1785г. – 13 двароў, 87 жыхароў, у 1816г. – 18двароў, 145 жыхароў, уладанне Галынскіх. У 1833 г. вёска, 142 сялянскія душы, размяшчалася каля возера Гразавец, у якім сялянам дазвалялася лавіць рыбу. У 1841 г. у складзе маёнтка Панькі.

У 1847 г. вёска, 24 двары, 204 жыхары, у складзе маёнтка Студзянец, маёмасць дачкі памешчыцы Ганны Свінвінавай. Асноўным заняткам сялян было земляробства, якое яны спалучалі з возніцкім промыслам. Перавозілі сельскагаспадарчую прадукцыю ў Клімавічы, Касцюковічы, Родню. Жыхары былі прыхаджанамі Саматэвіцкага праваслаўнага прыхода Троіцкай царквы. Меўся вятрак. Па рэвізскіх матэрыялах 1858 г. – 26 двароў, 255 жыхароў. Паводле перапісу 1897 г. – 66 двароў, 466 жыхароў, у Машаўской воласці Клімавіцкага павета Магілёўскай губерні. Належала мясцовай сельскай грамадзе, яна валодала 364 дзес. зямлі. У 1909 г. 74 двары, 527 жыхароў. У 1911 г. адкрыта земская школа, на базе якой пасля рэвалюцыі была створана працоўная школа 1-й ступені, дзе ў 1925 г. навучаліся 70 сялянскіх дзяцей з Вялікага Бора і навакольных вёсак, дзейнічаў гурток па ліквідацыі непісьменнасці сярод дарослых.

З 20.08.1924 г. да 08.12.1959 г. – цэнтр Вялікаборскага сельскага Савета Бялынкавіцкага раёна Калінінскай, а з 09.06.1927 г. Магілёўскай акругі. У 1926 г. – 87 двароў. У 1920-хг. функцыяніравала т-ва па сумеснай апрацоўцы зямлі. У 1927 г. адкрыты дзіцячыя яслі. У 1930 г. у вёсцы быў створаны калгас “Іскра”, працавалі кузня і вятрак.




Напярэдадні Вялікай Айчыннай вайны, у 1941 г., 122 двары, 444 жыхары. У верасні 1943 г. акупанты спалілі вёску, усе 122 двары. 228 землякоў загінулі на франтах, у памяць аб іх у 1967 г. пастаўлены абеліск. Пасля вайны вёска адбудавана. Паводле перапісу 1959 г. – 351, у 1970 г. 319 жыхароў. У 1986 г. 85 гаспадарак, 245 жыхароў, цэнтр саўгаса “Зарэчны”. Працавалі машынны двор,

базавая школа, бібліятэка, фельчарска –акушэрскі пункт, клуб, магазін, комплексны прыёмны пункт бытавога абслугоў
аддзяленне сувязі, 2 сталовыя. Планіровачна скла
дугападобнай вуліцы. У цэнтры да яе з ПнЗ
прамалінейная вуліца. Забудавана двухбакова, шчыльн
сядзібнага тыпу. Грамадскія будынкі сярод жылой забуд
ускраіне ўзведзены двухпавярховыя мураваныя 4-кват
народнага пісьменніка Беларусі, Ганаровага г
Касцюковічы І.Г. Чыгрынава.

У сувязі з аварыяй на Чарнобыльскай АЭС
жыхары перасёлены ў п. Крапіўня.



І.Г. Чыгрынаў